Адлюстраванне прыроды ў творах мастацтва як у прозе, так і ў жывапісе – гэта не толькі маляўнічае выяўленне яе прыгажосці, але і паказ эмацыянальнага ўспрымання. Я прааналізавала пейзажы аднакласнікаў, яны тэматычна блізкія: на ўсіх асеннія пейзажы, адлюстраваны пэўны стан ці нават момант прыроды, характарызуюцца малой колькасцю дэталяў. Адлюстраванне прыроды − гэта перш за ўсё працэс унутранага выяўлення эстэтычных уражанняў ад прычытанага літаратурнага твора. Як адзначаў М. Горкі: “Ад зліцця, супадзення вопыту літаратара і вопыту чытача і атрымліваецца тая мастацкая праўда – тая асаблівая пераканальнасць слоўнага мастацтва, якім і тлумачыцца сіла ўздзеяння літаратуры на людзей”. Гэтыя словы з’яўляюцца гіпотэзай майго даследавання. Каб праверыць гэта меркаванне, я правяла анкетаванне сярод аднакласнікаў і настаўнікаў, якія разглядалі малюнкі вучняў. А іх адказы і назіранні я сістэматызавала і прадставіла ў табліцы 2.

**Табліца 2 - Ужыванне дамінант у малюнках вучняў**

| Дамінанта | Нумар малюнка | | | | | | | | | Колькасць |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | |
| Вецер | + | + | + | + | | + | | + | + | 7 |
| Дождж | + | | | | | + | | | + | 3 |
| Туман | | | | | + | | | + | | 2 |
| Сонца | | | + | + | + | | + | | + | 5 |

Як у літаратурным творы, так і ў малюнках вучняў дамінанты былі аднолькавыя. А гэта значыць, што дамінанты ў пейзажах сапраўды ўздзейнічаюць на пачуцці чытачоў і фарміруюць асабістае ўспрыманне твора. Вынікае , што гіпотэза – правамерна.

УДК 821.161.3.09

Вуч. Я.В. Мархалюк
Нав. кір. А.М. Фалейчык, настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
А.А. Клімковіч, нам. дырэктара гімназіі
(ДУА “Гімназія № 192 г. Мінска”)

## АБУДЖЭННЕ ВУЧНЁЎСКАЙ ЦІКАВАСЦІ ДА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПРАЗ МАЛАВЯДОМЫЯ СТАРОНКІ ЖЫЦЦЯ АРКАДЗЯ КУЛЯШОВА

Трэці год мы займаемся навукова-даследчай работай па тэме “Малавядомыя старонкі біяграфіі Аркадзя Куляшова”. Падчас пошуку і аналізу матэрыялу зразумела, што пра ўсе цікавыя факты біяграфіі А. Куляшова вельмі хацелася падзяліцца з вучнямі нашай гімназіі.

Дапамагло спасцігнуць шматграннасць натуры А.Куляшова інтэрв'ю з Казімірам Камейшам (2019), які ведаў паэта і сустракаўся з ім. Мы вывучалі (2020) самую трагічную старонку біяграфіі А.Куляшова – страта сяброў-мсціслаўцаў Юлія Таўбіна і Змітрака Астапенкі. У час работы над тэмай нам давялося звяртацца да біяграфічных звестак з жыцця Аркадзя Куляшова, да ўспамінаў дачкі паэта Валянціны Аркадзьеўны, да яе эсэ "Лясному рэху праўду раскажу", успамінаў Сяргея Грахоўскага, Казіміра Камейшы і Аляксея Зарыцкага. Прапанаваная праца з'яўляецца своеасаблівым укладам у захаванне памяці аб класіку беларускай літаратуры.

Аркадзь Куляшоў – патрыёт свайго часу, сваёй Радзімы, вартаўнік чыстай і шчырай памяці пра сваіх сяброў. Ён быў адным з найбольш выдатных прадстаўнікоў шматнацыянальнай савецкай паэзіі, а яго творчасць – адным з найбольш яркіх і поўных увасабленняў гістарычнага шляху, пройдзенага беларускай нацыяй. Усебаковы і дынамічны вобраз эпохі спалучаны ў паэзіі Куляшова з рэалістычным вобразам чалавека ў яго бесперапынным руху і развіцці.

Арганічна звязаны з народнай глебай, з нацыянальнымі карэннямі беларускай паэзіі, з традыцыямі Купалы і Коласа, Аркадзь Куляшоў шмат дамогся, няспынна развіваючы ўсё нерухомае, коснае, духоўна ўзбуйняючы вобраз чалавека ў паэзіі.

Творы Аркадзя Куляшова перакладзены на 33 мовы свету, яго імем названы Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт, школы ў Мінску і Саматэвічах, вуліцы ў Мінску і Магілёве. Яго імя носіць і літаратурная прэмія, якая прысуджаецца Саюзам беларускіх пісьменнікаў.

Нам таксама захацелася ўнесці нешта значнае ва ўшанаванне памяці Аркадзя Куляшова і паглыбіць веды слухачоў віртуальнай экскурсіі пра нашых землякоў - таленавітых творцаў – Юлія Таўбіна і Змітрака Астапенку. Трэба зазначыць, што мы працягваем з 2019 года весці сайт, прысвечаны жыццю і дзейнасці А.Куляшова, дабаўляючы ўсё новыя і новыя цікавыя факты з яго біяграфіі. Акрамя прадстаўлення цікавай інфармацыі пра лёс "мсціслаўскай плеяды" ў музей "Пошук" (гімназія № 192 г. Мінска і школа №40 г. Мінска), сабраны намі матэрыял можа выкарыстоўвацца настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры як тэарэтычны матэрыял пры вывучэнні спадчыны паэта ў старэйшых класах. Зараз у музеі "Пошук" экскурсіі праходзяць віртуальна, але мы спадзяемся, што наша праца будзе

карыснай для захавання памяці аб беларускіх пісьменніках і абуджэння цікавасці да беларускай літаратуры ў цэлым.

На наш погляд, вывучэнне малавядомых старонак жыцця А. Куляшова актуальна па некалькіх прычынах.

Першае – 23 лістапада 2020 года адзначалася 110-годдзе з дня нараджэння Змітрака Астапенкі.

Другое – штогод у Курапатах праходзіць мерапрыемства “Ноч расстраляных паэтаў” па ўшанаванні памяці ахвяр сталінскага тэрору. Сярод тых, хто загінуў у ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года, быў Юлій Таўбін (у спісе №111 сярод 132).

Трэцяе – калі жыццёвы і творчы шлях А. Куляшова мы вывучаем на ўроках беларускай літаратуры, то пра лёс яшчэ двух “мсіслаўцаў” Юлія Таўбіна, Змітрака Астапенкі – сяброў Куляшова амаль нічога не ведаем.

Чацвёртае – малавядомыя старонкі жыцця беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, менавіта жыцця А.Куляшова, абуджаюць цікавасць да літаратуры ўвогуле.

Гіпотэза: дзякуючы распаўсюджанню інфармацыі пра біяграфію А. Куляшова і яго сяброў праз інтэрнэт-рэсурсы, правядзенне экскурсій, пазнавальнай гульні, сустрэчы і гутаркі ўзрастае ступень дасведчанасці вучняў пра жыццядзейнасць пісьменнікаў і абуджаецца цікавасць да беларускай літаратуры.

Аб’ект даследавання: літаратура, прысвечаная жыццяпісу Аркадзя Куляшова, Юлія Таўбіна, Змітрака Астапенкі.

Прадмет даследавання: жыццё і дзейнасць А.Куляшова, Юлія Таўбіна і Змітрака Астапенкі.

Мэта: абудзіць цікавасць вучняў да беларускай літаратуры праз вывучэнне і даследванне малавядомых старонак біяграфіі Аркадзя Куляшова і сяброў-мсціслаўцаў Юлія Таўбіна і Змітрака Астапенкі.

Задачы: пазнаёміцца з літаратуразнаўчымі крыніцамі па тэме навуковага даследавання; прааналізаваць умовы жыцця, творчасці паэтаў у 30-я гады; паглыбіць веды вучняў пра жыццё і дзейнасць Аркадзя Куляшова праз такія крыніцы інфармацыі, як сайт “Малавядомыя старонкі біяграфіі Аркадзя Куляшова” і экспазіцыя ў музеі “Пошук”.

Метады: збор, сістэматызацыя і асэнсаванне матэрыялу; даследаванне; аналіз матэрыялу; класіфікацыя матэрыялу; інтэрв’юіраванне.

Вывучаючы інфармацыйныя крыніцы пра Аркадзя Куляшова, мы адабралі і прааналізавалі менавіта той матэрыял, які закранае

вельмі важны перыяд яго біяграфіі. Далей прапанавалі матэрыял нашым гімназістам і вучням школы № 40. Гэта былі і гутаркі на ўроках, і віртуальныя экскурсіі, і знаёмства з нашым сайтам пра Аркадзя Куляшова, а таксама пазнавальная гульня пра малавядомыя старонкі Куляшова “Ці праўда?Ці хлусня?” (распрацоўка вучаніцы гімназіі № 192 г.Мінска Я.Мархалюк).

Для пацвярджэння або абвяржэння гіпотэзы мы правялі анкетаванне сярод слухачоў гімназічнай канферэнцыі (10-11 класы). Анкета складалася з 3 пытанняў: “1. Ці ведаеце вы, каму прысвечаны цыкл вершаў А.Куляшова “Маналог”?”; “2. Ацаніце ваш узровень зацікаўленасці беларускай літаратурай ад 1 да 5”; “3. Наколькі вас зацікавіла тэма нашых сустрэч, экскурсій, пазнавальнай гульні пра малавядомыя старонкі біяграфіі Аркадзя Куляшова? – Ацаніце ад 1 да 5”.

Атрымаліся наступныя вынікі. Па двух першых пытаннях спачатку да нашых сустрэч, гутарак, пазнавальнай гульні, віртуальных экскурсій вучні адказвалі адмоўна (86% слухачоў не ведалі ні вершаў Куляшова, ні яго старонак біяграфіі і больш за 50% слухачоў не цікавіліся беларускай літаратурай). Вынікі змяніліся, калі мы расказвалі і паказвалі (майт, экскурсіі) малавядомыя старонкі біяграфіі Аркадзя Куляшова, знаёмілі з яго творчасцю. Амаль усе нашы вучні зацікавіліся асобай Аркадзя Куляшова, звярнуліся да беларускай літаратуры (98% слухачоў ацанілі сваю цікавасць высока – у “5” балаў).

Такім чынам, можна сцвярджаць, што дзякуючы распаўсюджанню інфармацыі пра біяграфію А. Куляшова і яго сяброў праз інтэрнэт-рэсурсы, правядзенне экскурсій, пазнавальнай гульні, сустрэчы і гутаркі ўзрастае ступень дасведчанасці вучняў пра жыццядзейнасць пісьменнікаў і абуджаецца цікавасць да беларускай літаратуры.

## ЛІТАРАТУРА

1. Аўласенка, І. Маналог Аркадзя Куляшова пра гістарычны лёс Бацькаўшчыны / І. Аўласенка // Полымя. – 2013. – № 7. – С. 135-146.

2. Бярозкін, Р. Аркадзь Куляшоў: нарыс жыцця і творчасці / Р. Бярозкін. – Мінск: Нар. асвета, 1978. – 191 с.

3. Грахоўскі, С. Вершы, паэмы, проза, пераклады/ Успаміны. Публіцыстыка [Электронны рэсурс]. – 2010. http://www.grahouski.org/. – Дата доступа: 08.11.2020.

4. Маракоў, Л. Ахвяры і карнікі / [Электронны рэсурс]. – 2016 . Рэжым доступа: http://www.marakou.by/pub/file/one_night.pdf. – Дата доступа: 04.10.2020.